УДК 316.323.8:316.423]+929Фанон

*А. Д. Крывалап*

# Эвалюцыя поглядаў Ф. Фанона: ад антыкаланіяльнага руху да посткаланіяльных даследаванняў

*Артыкул уяўляе сабой аўтарскую інтэрпрэтацыю эвалюцыі поглядаў Ф. Фанона на аснове аналізу тэкстаў даследчыка. Пераасэнсоўваюцца погляды Ф. Фанона на разбуральны характар каланіялізму, яго ўздзеянне на псіхіку чалавека (раздвоенасць свядомасці, псіхічнае расшчапленне асобы), на ідэю выхаду з замкнёнага кола барацьбы з каланізатарамі шляхам альтэрмадэрнасці. Разглядаецца праблема захавання нацыянальнай культуры ў кантэксце глабальных выклікаў.*

Як акадэмічная дысцыпліна культуралогія не заўсёды заўважае і рэагуе адпаведным чынам на змены ў даследаванні культуры, якія адбываюцца па-за межамі развітых краін першага свету. Глабальныя трансфармацыі ў разуменні культуры і вывучэнні ідэнтычнасці краін, якія маюць сумны вопыт каланізацыі, на сённяшні дзень афармлены ў выглядзе посткаланіяльных і культурных даследаванняў. Яны паўсталі ў выніку шматгадовай працы над аднаўленнем уласнай суб'ектнасці народаў былых калоній.

На першы погляд, дастаткова складана прымерваць посткаланіяльны дыскурс на практыку існавання былых савецкіх рэспублік. Але захады, зробленыя ў межах посткаланіяльных даследаванняў, паступова атрымліваюць усё больш прыхільнікаў. Сёння расійскія даследчыкі абмяркоўваюць феномен унутранай каланізацыі ў часы існавання Расійскай імперыі, калі «пашыраючыся і ахопліваючы велізарныя прасторы, Расія каланізавала ўласны народ. Гэта быў працэс унутранай каланізацыі, другаснай каланізацыі ўласнай тэрыторыі» [3, с. 383–384]. Аднак, як заўсёды здараецца ў гісторыі буйных імперый, на іх месцы ўтвараюцца новыя дзяржавы, якія, адпаведна, патрабуюць сваёй ідэнтычнасці. Паводле меркавання А. Эткінда, «унутраная каланізацыя Расіі больш паходзіла на брытанскую каланізацыю Амерыкі, чым Індыі. Шмат якія нееўрапейскія этнасы былі асіміляваны альбо знішчаны, і імперыя займалася каланізацыяй уласнага мультыэтнічнага народа, які ў адказ фармуляваў новыя ідэнтычнасці. Большасць размаўляла на адной мове, і амаль ва ўсіх быў аднолькавы колер скуры» [Там жа, с. 386–387].

Разнастайныя захады і тлумачэнні, якія шырока прыняты ў посткаланіяльных даследаваннях, могуць запазычвацца і выкарыстоўвацца [1]. У кантэксце дадзенага пытання можна прыйсці да высновы, што карэктнае выкарыстанне стратэгіі посткаланіяльных даследаванняў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у навуковых пошуках валодае прагнастычным патэнцыялам, дазваляе з «дакладнасцю прадказваць як негатыўныя, так і станоўчыя вынікі тых ці іншых рашэнняў, знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі ў падзеях і з'явах, часцяком успрымальных як збег акалічнасцей» [2, с. 74]. Вывучэнне пасткаланіяльнай сацыяльна-гуманітарнай спадчыны дапаможа зразумець, якім чынам гэта закранае праблемы ідэнтычнасці, і вырашыць надзённыя пытанні ў сферы культуры.

У дадзеным даследаванні звернем увагу на асобныя аспекты каланіяльнага мінулага, пераадоленне якога выклікала найбольшыя цяжкасці і мае негатыўныя наступствы. Звернемся да акадэмічнай спадчыны Ф. Фанона, якая звязана з яго практычнай дзейнасцю.

*Мэта артыкула* – паказаць погляды Ф. Фанона на праблемы сацыяльнай псіхалогіі каланізацыі і аргументацыі ў падтрымку рэвалюцыйнага насілля і супраціўлення як формы псіхалагічнага катарсісу.

Каланіялізм – гэта не толькі фізічны прымус працаваць, але і разбурэнне традыцыйных сацыяльных інстытутаў. Гэта падаўленне волі і магчымасці дзейнічаць самастойна, знішчэнне і абясцэньванне нацыянальнай культуры, трансфармацыя сістэмы каштоўнасцей і яе падпарадкаванне ўяўленням каланізатараў. Наступствы каланіялізму, якія сёння істотна змяніліся, адбываюцца і ў сферы культуры, што падкрэсліваў у сваіх працах Ф. Фанон [4; 6; 8]. На яго думку, барацьба з каланізатарамі – больш складаны працэс, чым узброенае супрацьстаянне белых і чорных. Звяржэнне панавання белых і надзяленне ўладай чорных не вырашыць праблем каланізаванага грамадства. Складаная барацьба вядзецца за свядомасць каланізаваных і прыгнечаных. Ф. Фанон адзначаў, што культурнае вызваленне не адбываецца аўтаматычна пасля знікнення каланізатараў.

У першай кнізе «Чорная скура, белыя маскі» (1952) Ф. Фанон закранае праблемы, звязаныя з пераадоленнем каланіяльнай траўмы [6]. Каланіяльны стан – разбуральны для псіхікі як асобнага індывіда, так і грамадства, ад гэтага пакутуюць таксама і каланізатары. Даследчык выказвае здагадку, што псіхічны разлад асобы мае ў дадзеным выпадку каланіяльнае тлумачэнне і пераадолець яго не змогуць медыкаменты, пакуль будзе існаваць ганебная сістэма каланізацыі і падпарадкавання.

Чорны чалавек ведае, што ён чорны, але тое, што ён негр, давялі да яго ведама каланізатары. Менавіта так ажыццяўляецца стратэгія сацыяльнага канструктывізму, які апелюе дэтэрмінаванымі тлумачэннямі і праявамі расізму з боку каланізатараў: «Белыя людзі лічаць сябе вышэйшымі за чарнаскурых» [Там жа, p. 12]. Але існуе і той факт, што чарнаскурыя хочуць даказаць белым каштоўнасць і багацце іх думак, аднолькавае значэнне іх інтэлекту. Паказваючы дынаміку развіцця адносін белых і чорных, як яны звязаны паміж сабой і ці ёсць магчымасць для пераадолення наяўных бар'ераў, Ф. Фанон падкрэслівае:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Гэтая кніга з’яўляецца клінічным даследаваннем. <…> тыя, хто пазнае сябе ў гэтым, зробяць крок наперад. Я сур’ёзна спадзяюся пераканаць брата, чорнага ці белага, разарваць усімі сіламі ганебную ліўрэю, узмоцненую стагоддзямі непаразумення» (пераклад наш. – *А. К.*) [Там жа, p. 14]. На думку Ф. Фанона, чорны чалавек мае два вымярэнні, названыя пазней каланіяльнай раздвоенасцю, – разуменне таго, што сапраўдным чалавекам з’яўляецца толькі белы, і ўсведамленне марнасці ўласных спроб стаць больш белым, чым самі белыя. У якасці механізма пераадолення існуючага дзікунства каланізатары прапаноўваюць багацце еўрапейскай культуры і ў першую чаргу ўласную мову: «Размаўляць – значыць быць здольным выкарыстоўваць пэўны сінтаксіс, разумець марфалогію той ці іншай мовы, але перш за ўсё, гэта значыць прыняць культуру, падтрымаць вагу цывілізацыі. <...> Адпаведна, чалавек, які валодае мовай, валодае светам…» [Там жа, p. 17–18]. Мова становіцца паказчыкам культурнасці ці сапраўднасці чалавечага (цывілізаванага, а не дзікунскага) існавання: «Антыльскі негр, які жадае быць бялейшым, будзе бялейшым, калі авалодае культурнай прыладай, якою з’яўляецца мова» [Там жа, p. 38]. Культурнасць прадстаўнікоў каланізаваных народаў у вачах каланізатараў прама прапарцыянальная здольнасці размаўляць на мове каланізатараў, што ўпісваецца ў еўропацэнтрычнае бачанне працэсу каланізацыі.

Каб падкрэсліць значнасць еўрапейскай культуры, неабходна дыскрэдытаваць лакальную культуру, якой давядзецца ахвяраваць. Адсюль вынікае, што каланізаваны народ, у душы якога быў створаны комплекс непаўнавартасці, адмовіцца ад культурнай самабытнасці і застанецца сам на сам з мовай цывілізаванай нацыі. Менавіта з канструявання другаснасці і непаўнавартасці ў чарнаскурых народаў пачынаецца шматузроўневы працэс падпарадкавання і каланізацыі, які закранае ўсе сферы культурнага жыцця.

Вынікам доўгатэрміновых наступстваў з’яўляецца выхаванне каляровых інтэлектуалаў ці лакальных эліт, якія атрымалі адпаведную адукацыю ў метраполіі, але так і не сталі «белымі», і гэты разрыў непераадольны. Нават засвоіўшы ўсе нормы, каштоўнасці і практыкі каланізатараў, прадстаўнік падпарадкаваных народаў ніколі не будзе ў роўных адносінах з белымі. Гэтая перманентная занепакоенасць немагчымасцю стаць тым, кім ты імкнешся быць, з’яўляецца трыгерам да запуску незваротных механізмаў разладу псіхічнага здароўя. «Нармальнае негрыцянскае дзіця, якое вырасла ў нармальнай сям’і, стане ненармальным пры найменшым кантакце з белым светам», – разважае аўтар [Там жа, p. 143]. Але гэта адбудзецца не таму, што свет белых наўпрост вар’яцкі, а таму, што чарнаскураму чалавеку будзе прапанавана адпавядаць пэўным сацыяльным уяўленням белых, укараніцца ў белую ідэнтычнасць. Гэты працэс культурнага навязвання імкнецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

максімальна абмежаваць волю чалавека. Выратаванне, на думку Ф. Фанона, не ў пошуку чарговых масак ці вобразаў: «Не трэба рабіць ніякіх спроб, каб змясціць чалавека ў абалонку, калі яму лёсам наканавана быць вызваленым» [Там жа, p. 230]. Аднак фізічнае вызваленне магчыма, калі чалавек псіхічна свабодны.

Засноўваючыся на ідэі калектыўнага катарсісу, Ф. Фанон сцвярджае, што «ў кожным грамадстве, у кожным калектыве існуе <…> канал, выхад, праз які могуць быць вызвалены сілы, накопленыя ў форме агрэсіі» [Там жа, p. 145]. Найбольш адэкватнай формай супрацьстаяння каланіялізму, на яго думку, з'яўляецца ўзброеная барацьба прыгнечаных. Толькі ў барацьбе супраць эксплуатацыі, галечы, голаду чарнаскуры можа асэнсаваць асабістае існаванне, усвядоміць сваё адчужэнне і выйсці на шлях пераадолення адчужэння эканамічнага.

Разглядаючы каланіяльныя практыкі з дапамогай псіхааналітычных і марксісцкіх падыходаў у кнізе «Паміраючы каланіялізм» (1959), Ф. Фанон адзначаў, што каланіялізм змагаецца за ўзмацненне свайго панавання, чалавечай і эканамічнай эксплуатацыі, за захаванне ідэнтычнасці вобраза алжырца і абясцэньвання яго ўяўленняў пра самога сябе [4, p. 30]. Можна сказаць, што гэта класічны прыклад барацьбы рэпрэзентацый. Паміраючая каланіяльная практыка працягвае затуманьваць зрок і прапаноўвае падпарадкаваным гатовыя варыянты бачання саміх сябе. Асаблівую ўвагу каланізатары надаюць барацьбе ў сферы культуры. Знішчаючы культурны пласт каланізаванай краіны, яны імкнуцца давесці да народа, што вызваляюць яго і ратуюць пакрыўджаных лёсам. Ва ўяўленнях каланізатараў жыхары, напрыклад Алжыра, – гэта непазбежныя ахвяры, за выратаванне якіх заходняя культура змагаецца з радыкальнымі ісламістамі.

Каланізацыя – гэта не акупацыя, а выратаванне, як бы супярэчліва гэта не гучала: «Акупант, пакутуючы ад уласных няўдач, спрошчана і зневажальна прадстаўляе сістэму каштоўнасцей, з дапамогай якіх каланізаваны чалавек супрацьстаіць яго бясконцым нападкам. Тое, што <…> з'яўляецца сцвярджэннем адметнай ідэнтычнасці, клопатам пра захаванне цэльнасці некалькіх кавалкаў нацыянальнага існавання, тлумачыцца рэлігійнымі, магічнымі, фанатычнымі паводзінамі» [Там жа, p. 40]. Зараз ужо складана здзівіць спробамі расчалавечвання ворагаў, аднак звяртае на сябе ўвагу тое, што каланізаваны хоць і можа размаўляць як чалавек, але ўсё адно кіруецца інстынктамі і не здатны на высакародныя ўчынкі як каланізатар.

Ф. Фанон, асэнсоўваючы сваё жыццё ў Францыі, набыццё адукацыі ў метраполіі, падкрэсліваў: «Мова, культура – усяго гэтага недастаткова, каб зрабіць вас прыналежным да народа. Патрэбна нешта большае: агульнае жыццё, агульныя перажыванні і ўспаміны, агульныя мэты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

<…> Маё знаходжанне ў Францыі паказала мне, што я належу да алжырскай супольнасці, <…> што я чужы ў Францыі» [Там жа, с. 175].

Трэцяя кніга «Праклятыя землі» (1961) убачыла свет пасля заўчаснай смерці Ф. Фанона. З яго артыкулаў, прамоў, выступленняў было падрыхтавана некалькі зборнікаў. Назва кнігі «Праклятыя землі» – гэта трэці радок з гімна пралетарыяту «Інтэрнацыянал». У ёй адлюстраваны больш радыкальны падыход да вызваленчай барацьбы і выкарыстання палітэканамічных тлумачэнняў пераадолення сацыяльнай няроўнасці. Каланіяльныя практыкі з'яўляюцца татальнымі, такім жа татальным будзе гвалт і падпарадкаванне ва ўсіх сферах штодзённага жыцця. Каланіялізм мэтанакіравана знішчае праявы чалавечага ў чалавеку, ствараючы з яго дысцыплінаваную машыну [7, p. 52]. Магчымасці калектыўнага катарсісу выходзяць далёка за межы сімвалічнага, для яго дасягнення магчымы непрымальныя раней формы барацьбы з каланізатарамі. Ф. Фанон адзначыў: «Каланіялізм не проста навязвае ўласнае панаванне сучаснасці і будучыні краіны <…> ён звяртаецца да мінулага прыгнечанага народа, каб сказіць, знявечыць і знішчыць яго» [Там жа, p. 210]. Вельмі няпроста супрацьстаяць гэтай падрыхтаванай стратэгіі барацьбы, таму ў пастку нібыта сацыяльнай перабудовы трапляюць каланізаваныя інтэлектуалы, якія рознымі шляхамі далучыліся да еўрапейскай цывілізацыі. Тутэйшую інтэлігенцыю пужае магчымасць стаць чужымі на ўласнай зямлі, таму што з дапамогай культуры яны трапілі ў заходнюю цывілізацыю, «здолелі стаць часткай цела еўрапейскай культуры» [Там жа, p. 219]. Пазбавіўшыся ад каланізатараў, інтэрпеліраваныя носьбіты заходняй культуры будуць вымушаны шукаць сваё месца ў грамадстве, а могуць і не знайсці.

Ф. Фанон разглядае гэтую сітуацыю на прыкладзе развіцця нацыянальнай культуры пад уплывам каланізатараў, актарамі якой з'яўляюцца каланізаваныя інтэлектуалы. *Першы ўзровень – гэта* безумоўная *культурная асіміляцыя*, калі крыніцай натхнення і прыцягнення робіцца ўсё еўрапейскае (*каланізацыя і мадэрнізацыя*). *Другі ўзровень* – калі каланізаваныя інтэлектуалы вырашаюць прыгадаць, хто яны. Адразу ўзнікае заклапочанасць у разуменні сябе і непаразуменне з тымі, на каго ты падобны. А што яшчэ застаецца рабіць «чорнаму» аўтару, які выхаваны на еўрапейскай культуры, імкнецца растлумачыць уласнае бачанне свету, але яно не заўсёды адпавядае светапоглядам каланізатараў (*антыкаланізацыя*). Нарэшце *трэці ўзровень – шлях барацьбы*. Інтэлектуал выбірае шлях абуджальніка, які заклікае іншых да змагання супраць каланіялізму (*альтэрмадэрнасць*). Каланіялізм не адмаўляе ў праве на існаванне лакальных культур, пытанне ў тым, што лічыцца культурай і што можа быць дазволена? Калі інтэлектуал імкнецца стварыць нацыянальны культурны твор, ён не разумее, што выкарыстоўвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыёмы і мову, запазычаныя ў незнаёмцаў са сваёй краіны, таму яго тварэнне на справе нагадвае экзотыку.

Каб стаць сваім у нацыянальнай культуры, неабходна праз культурныя дасягненні вяртацца да народа, змагацца супраць духоўнага заняволення. Як сцвярджае Ф. Фанон, «нацыянальная культура – гэта не фальклор і не абстрактны папулізм, які нібыта здольны выявіць сапраўдную прыроду людзей, <…> а цэлы комплекс намаганняў, накіраваных на апісанне, апраўданне і ўхваленне дзеянняў, якімі народ стварыў сябе і падтрымлівае ўласнае існаванне» [Там жа, p. 233].

Імкненне пазбегнуць канфлікту паміж культурай падпарадкаванай і каланіяльнай не прывядзе да перагляду каланіяльных меж. На думку Ф. Фанона, культура – гэта выражэнне нацыі, яе пераваг, табу і патэрнаў. Нацыянальная культура – гэта агульная сума ўсіх ацэнак, вынік унутранай і знешняй напружанасці ў грамадстве ў цэлым. У каланіяльнай сітуацыі культура, якая «ўдвая пазбаўлена падтрымкі нацыі і дзяржавы, адпадае і гіне. Таму ўмовай яе існавання з'яўляецца нацыянальнае вызваленне і адраджэнне дзяржавы» [Там жа, p. 244]. Ф. Фанон падтрымліваў імкненне каланіяльных народаў захаваць самабытнасць сваёй культуры, у якіх бы традыцыяналісцкіх і антызападніцкіх формах яно не ажыццяўлялася. Аднак барацьба за вызваленне, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці патрабуюць з'яўлення новых культурных форм і сэнсаў. Каб працэс знішчэння каланіялізму і знікнення каланізаванага чалавека быў плённым, Ф. Фанон прапанаваў інтэлектуалам пабудаваць сваю нацыю. Безумоўна, гэтая амбіцыйная ідэя не гарантуе аўтаматычнага паляпшэння ўмоў жыцця для ўсіх, аднак дазваляе вырвацца з псіхалагічнага і духоўнага прыгнёту (падпарадкавання) праз прапанову альтэрнатыўнай мадэрнасці.

У кнізе «Да афрыканскай рэвалюцыі» (1964) Ф. Фанон разважае пра ўзаемадзеянне расізму і культуры. Каланіялізм не імкнецца максімальна хутка знішчыць лакальную культуру. Гістарычныя назіранні паказваюць, што мэтай каланіяльнай сістэмы з'яўляецца працяг агоніі, чым поўнае знікненне падпарадкаванай культуры. Лакальная культура, якая «калісьці была жывой і адкрытай для будучыні, ператвараецца ў закрытую, замацоўваецца ў каланіяльным статусе і трапляе ў ярмо прыгнёту. <...> Культурная муміфікацыя вядзе да муміфікацыі індывідуальнага мыслення. Абыякавасць, якая шырока назіраецца ў каланізаваных народаў, з'яўляецца лагічным наступствам гэтай аперацыі» (пераклад наш. – *А. К.*) [8, p. 34]. Фактычна культурнае падпарадкаванне – гэта і ёсць асноўны механізм трансфармацыі грамадства, які дазваляе пераадолець каланіяльную залежнасць. Вызваленне поўнасцю знішчае каланіяльную сістэму, ад «перавагі мовы прыгнятальніка і "дэпартаменталізацыі" да мытнага саюза, які на самай справе ўтрымлівае былыя калоніі ў сетках



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, моды і вобразаў каланізатара» [Там жа, p. 105]. Культурная і інтэлектуальная залежнасць былых калоній ад метраполій можа расцягвацца на дзесяцігоддзі. Што ж датычыць аднаўлення вызваленай ад каланіялізму культуры, стварэння новага чалавека і новай культуры, то гэты працэс больш складаны і працяглы.

У «Адчужэнні і свабодзе» (2018), складзенай з перакладаў разнастайных выступленняў і публікацый Ф. Фанона, што не ўвайшлі ў ранейшыя выданні, звяртаецца ўвага на праблему ідэнтычнасці каланізаваных народаў [5]. Зыходзячы з меркаванняў даследчыка, рэвалюцыйная барацьба змяняе прыгнечаныя масы: жыццё іх набывае сэнс, трансцэндэнтнасць, мэту: пакончыць з эксплуатацыяй, кіраваць сабою і для сябе [Там жа, p. 1–2].

Падагульняючы сказанае вышэй, адзначым: спалучэнне медыцынскіх фактараў з сацыяльнымі адкрылі для Ф. Фанона новыя магчымасці ў тлумачэнні псіхічных захворванняў і падштурхнулі да разумення разбуральнага для чалавечай псіхікі і культуры каланіялізму. Ідэі і здагадкі, сфармуляваныя Ф. Фанонам, былі заўважаны і да сённяшняга дня актыўна абмяркоўваюцца ў акадэмічных кантэкстах. Прапанаваная ім ідэя выхаду з тупіковага супрацьстаяння мадэрну і антымадэрну праз трэці шлях можа быць дастаткова прывабнай, як і канцэпт неабходнасці дэкаланізацыі тутэйшых інтэлектуалаў. Суб'ектыўныя канцэпцыі ідэолага нацыянальна-вызваленчага руху, выкладзеныя ў яго кнігах, раскрываюць асаблівасці фарміравання нацыянальнай свядомасці прыгнечаных народаў, якія ў сённяшняй рэальнасці становяцца суб'ектамі сусветнай палітыкі, творцамі сваёй гісторыі.

У пачатку XXI ст. кнігі Ф. Фанона чытаюцца і ўспрымаюцца інакш, чым у мінулым стагоддзі, але праблемы каланізацыі свядомасці і падпарадкаванасці застаюцца і толькі абвастраюцца.

1. *Жеребкин, С.* «Могут ли угнетенные…?», или Украинский постколониальный феминизм между Ж.-П. Сартром и Ф. Фаноном / С. Жеребкин // Гендерные исследования. – 2008. – № 17. – С. 149–169.

2. *Матвеенко, А. Г.* Постколониальные исследования: проблемы и перспективы / А. Г. Матвеенко // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2016. – № 1 (25). – С. 69–75.

3. *Эткинд, А.* Внутренняя колонизация. Имперский опыт России / А. Эткинд. – М. : Новое лит. обозрение, 2013. – 448 с.

4. *Fanon, F.* A dying colonialism / F. Fanon. – New York : Grove Press, 1967. – 181 p.

5. *Fanon, F.* Alienation and Freedom / F. Fanon. – London : Bloomsbury Academic, 2018. – 816 p.

6. *Fanon, F.* Black skin, white mask / F. Fanon. – London : Pluto Press, 1986. – 232 p.

7. *Fanon, F.* The Wretched of the Earth / F. Fanon ; Preface by J.-P. Sartre. – New York : Grove Press, 1963. – 320 p.

8. *Fanon, F.* Toward the African revolution / F. Fanon. – New York : Grove Press, 1967. – 197 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*A. Krivolap*

**The evolution of F. Fanon's views:
from anti-colonial movement to post-colonial studies**

*As an academic discipline, culturology does not always notice and respond appropriately to changes in the study of culture that occur outside the developed countries. Global transformations in the understanding of culture and the study of the identity of countries that have the sad experience of colonization today are framed in the form of postcolonial and cultural studies. They arose as a result of many years of work on restoring the own subjectivity of the peoples of the former colonies. This article examines the evolution of F. Fanon's views, which proved the destructive nature of colonialism on the human psyche, through the colonial duality of consciousness and the mental disintegration of the individual. F. Fanon also proposed a way out of the vicious circle of struggle against the colonizers (colonization – anti-colonization), through the third way – altermodernity.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 02.03.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ